ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі центр і сетка публічных бібліятэк”
Аддзел бібліятэчнага маркетынга

# Асветнікі зямлі беларускай

Бібліяграфічны агляд



Гарадок, 2021

Беларуская зямля здаўна славілася сваімі асветніцкімі традыцыямі. Як адзначае вядомы даследчык даўніны Адам Кіркор, *«в этом народе испокон века таилось много творческих сил, воображение было живое, ум от природы сосредоточенный, склонный к гипотезам, к неестественным предположениям, к своеобразным истолкованиям».*

Цяжка пераацаніць велізарную гістарычную значнасць беларускага пісьменства для культурнай і духоўнай спадчыны Беларусі і Расіі, роўна як і той вялікі ўклад, які ў свой час унеслі вялікія беларускія асветнікі, па праву прызнаныя не толькі ў сябе на радзіме, але і стаўшыя фігурамі еўрапейскага маштабу. Першым на розум прыходзіць беларускі першадрукар Францыск Скарына, які пераклаў на беларускую мову і выдаў 23 кнігі Бібліі, першую - у 1517 годзе.

Таксама княгіня Еўфрасіння Полацкая, якая стала манашкай у 12 гадоў і правяла жыццё, дапамагаючы бедным. Перапісывала кнігі, будавала царквы і манастыры па ўсёй Беларусі, якія станавіліся цэнтрамі адукацыі. Гэта першая беларуская асветніца і першая жанчына на Русі, якая была кананізавана.

Спіс можна папоўніць апавяданнямі аб такіх вялікіх дзеячах, як: Сімяон Полацкі, Кірыла Тураўскі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Мікола Гусоўскі, Пётр Мсціславец, Спірыдон Собаль і інш. Прапануем чытачам азнаёміцца з аглядам літаратуры наяўнай у фондзе Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэкі аб беларускіх асветніках, якія ўнеслі істотны ўклад у распаўсюджванне ведаў сярод продкаў сучасных беларусаў.

**Мяснікоў, А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі : гістарычныя партрэты / А. Ф. Мяснікоў. – Мінск : Литература и искусство, 2009. – 344 с.**




У гісторыі кожнай краіны самы адметны след пакідаюць, як вядома, яе вялікія і знакамітыя асобы: кіраўнікі, асветнікі, пісьменнікі, мастакі, музыканты і інш.

У дадзенай кнізе можна азнаёміцца з нарысамі аб Францыске Скарыне, Ефрасінні Полацкай, Васіліі Цяпінскім, Льве Сапеге, Спірыдоне Собале, Сімеоне Полацкім, Казіміры Ляшчынскім і многімі іншымі біяграфічнымі партрэтамі неардынарных людзей нашай Айчыны. На працягу стагоддзяў па-рознаму адносіліся да іх улады і грамадства. Адных славілі, узносілі ў свой час, іншых - асуджалі, пераследвалі, каралі ...




**Чаропка, В. Лёсы ў гісторыі / Вітаўт Чаропка. – Мінск : Беларусь, 2005. – 559 с.**

Вядомы пісьменнік і папулярызатар нашага слаўнага мінулага Вітаўт Чаропка (сапраўднае імя Віктар Кузьміч) – не мае патрэбу ў прадстаўленні беларускаму чытачу. Упершыню ён выступіў у друку са сваімі навукова-папулярнымі нарысамі яшчэ ў канцы 80-х гг. XX ст., але асаблівую папулярнасць атрымаў на рубяжы стагоддзяў. «Лёсы ў гісторыі» - расказваюць аб знакамітых асобах нашага мінулага: Ефрасінні Полацкай, Льве Сапеге, Сімеоне Полацкім, Казіміры Ляшчынскім, Яне Баршчэўскім і інш. Аднак, гэта не проста зборнік біяграфій, аўтар спрабуе пракрасціся ў саму сутнасць, высвятляе прычыны творчых поспехаў і няўдач, таго, што менавіта спрабавалі данесці да нас нашыя далёкія продкі, і што менавіта падштурхнула іх на вялікія тварэнні. Кім яны былі ў тую далёкую эпоху і якую ...




**Кузьміч, М. П. Імёны, асобы, лёсы: Ураджэнцы Віцебшчыны ў далёкім і блізкім замежжы / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. – 352 с.**

У алфавітным парадку змешчана звыш 600 біяграфій нашых вядомых землякоў – ураджэнцаў Беларусі, лёс якіх склаўся так, што па розных абставінах яны апынуліся ў замежжы. Але і там, насуперак цяжкасцям і перашкодам, яны знайшлі сябе і сваё месца ў жыцці, пакінуўшы добры след у розных яго сферах. Гэтыя асобы – гонар і нашай гісторыі. Біяграфічны даведнік адрасуецца усім, хто цікавіцца мінулым, найперш моладзі.




**Праз смугу стагоддзяў / склад. М. Багадзяж. – Мінск : Народная асвета, 1993. – 104 с.**

У кнізе сабраны гістарычныя нарасы пра людзей беларускага грамадска-палітычнага жыцця і культуры Ефрасінні Полацкай, Сымоне Будным, Казіміры Лышчынскім і інш.




**100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі / склад. І. Саверчанка, З. Санько. – Мінск : Звязда, 1993. - 80 с.**

Прачытаўшы кнігу “100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі”, кожны мае магчымасць даведацца аб тым, хто заснаваў беларускае кнігадрукаванне? Якая нацыянальная рэліквія найкаштоўнейшая для беларусаў? Хто такая Ефрасіння Полацкая? Кірыла Тураўскі? Мікола Гусоўскі? Сымон Будны? Васіль Цяпінскі? І шмат чаго іншага.

**Тарасаў, К. Памяць пра легенды : постаці беларускай мінуўшчыны / Кастусь Тарасаў. – Мінск : Полымя, 1994. – 270 с.**




У Кастуся Тарасава – сваё пісьменніцкае, эмацыянальна афарбаванае бачанне гісторыі. Ён умее пранікнуць ва ўнутраны свет людзей, аддалёных ад нас стагоддзямі, будзь гэта асветнік Сімяон Полацкі, ці падзвіжнік Сымон Будны, ці змагар супраць уніі Афанасій Філіповіч.




**Батвіннік, М. Б. Азбука на ўсе часы / М. Б. Батвіннік. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 288 с.**

Апавяданне вядзецца аб вучэбных кнігах для першапачатковага навучання грамаце, якія выходзілі ў Вялікім княстве Літоўскім, а потым у Маскве. Над імі працавалі выдатныя асветнікі 15-18 ст. – Францыск Скарына, Іван Фёдараў,  Мялецій Сматрыцкі, Спірыдон Собаль, Сімеон Полацкі і інш.

**Дубянецкі, Э. С. Асветнікі Беларусі. Іван Фёдараў, Пётр Мсціславец, Спірыдон Собаль / Э. С. Дубянецкі. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2018. - 64 с.**




У кнізе ў папулярнай форме распавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і шматгранную выдавецкую і асветніцкую дзейнасць Івана Фёдарава, які выдаў першую друкаваную кнігу на тэрыторыі Расіі і з’яўляецца заснавальнікам кнігадрукавання ў Расіі і Украіне, беларускага і расійскага друкара і гравёра Пятра Мсціслаўца, які працаваў на тэрыторы

Расіі, Украіны, Літвы, а таксама прадаўжальніка справы Францыска Скарыны Спірыдона Собаля, друкарская справа якога закранала землі Беларусі і Украіны. Кніга прызначана для навучэнцаў і выкладчыкаў навучальных устаноў нашай краіны, а таксама для ўсіх, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай беларускага народа.




**Францыск Скарына і яго час : энцыклапедычны даведнік / гал. рэд. І. П. Шамякін. – Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя, 1988. – 608 с.**

Персанальная энцыклапедыя, якая асвятляе асноўныя моманты жыцця і дзейнасці першагадрукара і асветніка.




**Немировский, Е. По следам Франциска Скорины : документальная повесть / Е. Л. Немировский. – Минск ; Беларусь, 1990. – 271 с.**

Известный исследователь книги и истории книгопечатания увлекательно рассказывает о том, как ученые России и других стран искали и находили книги Ф. Скорины, документы о его жизни и деятельности, сообщает интересные подробности о самом первопечатнике и его книгах.

***Бібліятэкары аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры маюць магчымасць таксама прапанаваць сваім чытачам шмат кніг аб гэтых славутых людзях нашай краіны.***




**Клышка, А. К. Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга. – Мінск : Полымя, 2000. – 96 с.**

У далёкай Італіі, у адным з найстарэйшых у свеце Падуанскім універсітэце ёсць знакамітая “Зала сарака”, дзе вісяць партрэты слаўных з найслаўнейшых, хто вучыўся альбо вучыў тут. Сярод іх другі ад покуці, каля кафедры Галілея,— Францішак Скарына. У кніжцы расказваецца аб жыцці нашага выдатнага земляка, першадрукара ўсходняга славянства. Чытач даведаецца таксама, на чым пісалі нашы продкі, як ствараліся кнігі ў сярэднявеччы, як было вынайдзена кнігадрукаванне.

**Слаўны сын Беларусі : для сярэд. і ст. школьн. узросту / скл. С. С. Панізнікава. – Мінск : Юнацтва, 1994. – 254 с.**




У выданне ўвайшлі аповесці, апавяданні і вершы, прысвечаныя Ф. Скарыне. Адкрываюць зборнік перакладзеныя на сучасную беларускую мову прадмовы з кніг Бібліі першадрукара. Далей прыведзены датаваны спіс усіх кніг асветніка і спіс дат з гісторыі еўрапейскага кнігадрукавання. Складальнікі сабралі ёмістыя і вобразныя выказванні навукоўцаў, пісьменнікаў, дзеячаў культуры пра Ф. Скарыну. Асобны раздзел прысвечаны беларускім паслядоўнікам слаўнага сына Беларусі, прыведзены біяграфіі. Паралельна з вывучэннем фактаў чытачу прапануюцца арыгінальныя мастацкія творы М. Багдановіча, М. Гарэцкага, А. Дударава, У. Караткевіча, А. Клышкі, Я. Купалы, А. Лойкі, А. Салаўя, Ф. Янкоўскага.




**Марціновіч, А. А. Златавуст з Турава, альбо якая яна, старажытная Тураўшчына? : нарыс : для мал. школьн. узросту / А. А. Марціновіч. – Мінск : Юнацтва, 2000. – 127 с.**

Аўтар зацікаўлена расказвае пра жыццё і дзейнасць аднаго са святых зямлі беларускай, найвялікшага пісьменніка старажытнасці, епіскапа Кірылы Тураўскага, якога сучаснікі за мудрасць празвалі "другім златавустам".

**Марціновіч, А. А. Сімяон, сын Полацка : нарыс : для мал. школьн. узросту / А. А. Марціновіч. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 110 с.**




Чалавек, пра якога пойдзе гаворка ў кнізе, заслужыў славу выдатнага пісьменніка, настаўніка і асветніка. Стоячы ля вытокаў рускага тэатра, паэзіі і педагогікі, наш знакаміты зямляк унёс неацэнны ўклад і ў развіццё беларускай літаратуры, культуры. Яго ведалі ў свеце далёка ад Беларусі. Але ён заўсёды з любасцю ўспамінаў яе і свой родны горад у гонар якога, узяў сабе прозвішча - Полацкі.




**Марціновіч, А. А. Святая Еўфрасіння, альбо адкуль ёсць, пайшла Полацкая зямля : нарыс : для малод. школьн. узросту / А. А. Марціновіч. – Мінск : Беларусь, 2008. – 111 с.**

Захоплена і аб'ектыўна расказваецца пра жыццё і дзейнасць выдатнай беларускай жанчыны-асветніцы XII стагоддзя Еўфрасінні Полацкай. Асаблівая ўвага звернута на яе ролю ў асветніцтве роднага народа, на тое, як праз стагоддзі самаахвярны лёс Еўфрасінні Полацкай стаў сімвалам нацыянальнай трываласці і самасвядомасці.




**Гарошка, Л. Святая Еўфрасіння-Прадслава, патронка Беларусі : нарыс жыцця і дзейнасці / Л. Гарошка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – 124 с.**

Апрача арыгінальнага даследвання, прысвечанага жыццю і дзейнасці Еўфрасінні Полацкай, у кнігу вядомага гісторыка беларускай царквы айца Льва Гарошкі ўвайшлі таксама яго артыкулы пра дахрысціянскую веру нашых продкаў, пачаткі хрысціянства і культ Багародзіцы на Беларусі.




**Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі : для малодш. і сярэдн. школьн. узросту / склад. І. Б. Клепікаў. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. – 2013. – 278 с.**

Творы У. Бутрамеева, А. Марціновіча, І. Масляніцынай і М. Багадзяжа знаёмяць чытача з выдатнымі гістарычнымі асобамі беларускай зямлі. У займальнай папулярнай форме яны выкладаюць старажытную гісторыю Беларусі, вучаць любіць свой край.




**Костин, Б. А. Симеон Полоцкий / Б. А. Костин. Минск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 240 с.**

Костин — автор более десятка книг, в том числе в «молодогвардейской» серии «ЖЗЛ» — представляет жизнеописание Симеона Полоцкого — уникальной личности не только для века семнадцатого, но и для последующих столетий. Одновременно писатель во всей полноте представляет противоречивые оценки, которые давались деятельности Симеона Полоцкого его современниками, а также

исторический фон, на котором проходило житие выдающегося просветителя.

**Источники:**

Кириенко, Н. Н. 8 интересных фактов про книгопечатание в Беларуси / Н. Н. Кириенко // ГУО «Жукневская детский сад - базовая школа Толочинского района» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://schyknevo.schools.by/pages/8-interesnyh-faktov-pro-knigopechatanie-v-belarusi. - Дата доступа: 20.04.2021.

Кричко, О. П. Святые-просветители беларуси 12-13 столетий / О. П. Кричко. – Режим доступа: https://elib.bsu.by/bitstream. - Дата доступа: 19.04.2021.

Просветители земли белорусской / Гомельская областная универсальная библиотека им. В. И. Ленина. – Режим работы: https://www.livelib.ru/book/1001093677-ljosy-gistoryi-vitat-charopka. - Дата доступа: 19.04.2021.

**Складальнік: Н. П. Фёдарава**

**Адказны за выпуск: А. В. Абрамава**

**Надрукавана на прынтары**
**Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі**

**Тыраж 5 экз.**

**211573, г. Гарадок, вул. Ленінская, д. 4**

**тэл. 4-57-74**